**УДК 726.82+351.853/04/4/(476)**

# ПАХАВАЛЬНЫЯ ПОМНІКІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV – XVIII СТАГОДДЗЯЎ ВЫЗНАЧЭННЕ, СТРУКТУРА І КЛАСІФІКАЦЫЯ

***В.У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разгледжаны тэарэтычныя падыходы да вызначэння паняцця пахавальнага помніка як катэгорыі археалагічнай навукі. Разгледжаны пытанні структуры пахавальнага помніка ў дачыненні да Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў. Пад пахавальнымі помнікамі XIV – XVIII стагоддзяў разумеюцца як асобныя пахаванні і пахавальныя комплексы, так і могілкі, што адносяцца да перыяду XIV – XVIII стагоддзяў. Вылучэнне групы пахавальных помнікаў са знешнімі прыкметамі пахаванняў XIV – XVIII стагоддзяў дазволіла пашырыць кола даследуемых аб'ектаў і прасачыць асаблівасці іх тэрытарыяльнага размяшчэння. Дана класіфікацыя пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў у залежнасці ад намагільнага збудавання, наяўнасці культавай пабудовы ў структуры (метаструктуры) пахавальнага помніка, асаблівасцяў пахавальнага інвентару.*

Пахаванні – адзін з двух асноўных відаў археалагічных помнікаў (другім з'яўляюцца паселішчы). Сістэматычныя раскопкі пахаванняў у Заходняй Еўропе і ЗША пачаліся ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя [1, с. 6]. Да канца XVIII стагоддзя адносяцца і звесткі аб першых аматарскіх раскопках пахавальнага помніка на Беларускім Падзвінні [2, с. 16]. Адкрыццё вялікай колькасці пахаванняў на працягу XIX – XX стагоддзяў дазволіла перайсці да асэнсавання атрыманых даных. Адбывалася выяўленне агульных структурных элементаў, вылучаліся формы і тыпы пахаванняў, ствараўся адмысловы катэгарыяльны апарат, распрацоўваліся канцэптуальныя падыходы да аналізу пахаванняў. Інтэрпрэтацыя даных, якія былі атрыманы пры вывучэнні пахаванняў, ажыццяўлялася для атрымання інфармацыі аб рэлігійных уяўленнях людзей мінулага, сацыяльнай структуры грамадства, аб лакальных асаблівасцях у межах этнакультурных груп і зменах, якія адбываліся ў іх з часам [1, с. 6].

Пахавальныя помнікі розных гістарычных перыядаў даследаваны ў неаднолькавай ступені. Увага спецыялістаў у асноўным скіроўвалася на вывучэнне тых пахавальных помнікаў, якія былі добра заўважны на паверхні зямлі, бо маркіраваліся адмысловай канструкцыяй – курганамі [1, с. 6]. Прыярытэт аддаваўся даследаванню пахаванняў больш ранніх, чым тыя, якія адносяцца да XIV і тым больш да XVIII стагоддзя. Гарадскія пахаванні вывучаны лепш. Вывучэнне сельскіх пахаванняў XIV – XVIII стагоддзяў да апошняга часу было пераважна вынікам выпадковага выяўлення, а самі яны не з'яўляліся прадметам спецыяльнага даследавання. Таму пахаванні Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў – адносна маладаследаваная катэгорыя археалагічных помнікаў Беларусі. Выніковасць іх вывучэння ў немалой ступені залежыць ад вызначэння паняцця «пахавальны помнік», звязаных з ім дэфініцый («пахаванне», «магіла», «пахавальны комплекс», «могільнік») і дакладнага іх выкарыстання; вызначэння структуры пахавальнага помніка; класіфікцыі пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст.

**Паняцце пахавальнага помніка.** Паняцце «пахавальны помнік» утворана па аналогіі з тэрмінам «археалагічны помнік». Тэрмін гэты новы. Ён адсутнічае ў археалагічных слоўніках У. Брэя і Д. Трампа [3] і Г. Мацюшына [4]. Няма яго і ў энцыклапедыі «Археалогія і нумізматыка Беларусі» [5]. Дэфініцыя «пахавальны помнік» з'яўляецца ў найноўшым акадэмічным выданні «Археалогія Беларусі», дзе вызначаецца як могільнік – сукупнасць пахавальных комплексаў [6, с. 177]. Разам з тым маецца вызначэнне пахавальнага помніка, якое прапанаваў расійскі археолаг В.С. Альхоўскі. На яго думку, не толькі могільнікі (пахавальныя групы), але і пахавальныя комплексы, і пахаванні з'яўляюцца пахавальнымі помнікамі, якія кумулятыўна падзяляюцца на тры згаданыя структурныя ўзроўні [7, с. 90]. Інакш кажучы, пахавальны помнік мусіць разглядацца як складаная сістэма, якая можа ўключаць пахавальныя помнікі больш нізкага структурнага ўзроўню.

Вызначэнне пахавальнага помніка В.С. Альхоўскім стала вынікам спецыяльнага тэарэтычна-метадалагічнага даследавання, таму вартае ўвагі. Акрамя таго, у выпадку прыняцця першага вызначэння пахавальнага помніка, мы сутыкнемся з цяжкавырашальнымі праблемамі. Па-першае, калі пахавальны помнік – гэта выключна могільнік, то пахавальны помнік XIV – XVIII стагоддзяў – гэта выключна могільнік, створаны ў XIV – XVIII стагоддзях. Між тым могілкі могуць утрымліваць розначасовыя пахаванні, у тым ліку і тыя, якія не адносяцца да XIV – XVIII стагоддзяў. У прыватнасці, наяўнасць на могілках з пахаваннямі XIV – XVIII стагоддзяў курганоў – досыць частая для Беларускага Падзвіння з'ява. Па-другое, спецыфіка могільніка ў тым, што ён утвараецца дастаткова аўтаномнымі адзін ад аднаго пахавальнымі комплексамі. Ускрыццё аднаго нечым адметнага пахавання часам дае больш інфармацыі, чым даследаванне некалькіх дзясяткаў суседніх з ім магіл, і істотна карэктуе нашы ўяўленні. Практычна

ніводны могільнік Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў не даследаваны цалкам. Калі мы прымем першае вызначэнне пахавальнага помніка, то сутыкнемся з адсутнасцю даследаваных пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў. Улічваючы пазначаныя акалічнасці, мы будзем зыходзіць з другога вызначэння, у адпаведнасці з якім да пахавальных помнікаў адносяцца пахаванні, пахавальныя комплексы і пахавальныя групы.

**Структура пахавальнага помніка.** Паняцці пахавальнага комплексу і пахавальнага помніка прыйшлі ў айчынную археалагічную навуку з расійскай археалогіі. У 1976 годзе Н.Б. Ляонавай і Ю.А. Смірновым была прапанавана схема фармалізаванага апісання пахавання. Пахаванне вызначалася як пахавальны комплекс (магіла), які складаецца з наступных элементаў: пахавальнага збудавання, астанкаў памерлага і пахавальнага інвентару. Пахавальнае збудаванне – гэта тыя кампаненты пахавальнага комплексу, якія характарызуюць замкнёную прастору, прызначаную для змяшчэння памерлага. Пахавальны інвентар не з'яўляецца абавязковым элементам, таму пахавальны комплекс ствараецца двума першымі элементамі [8, с. 19 – 20].

У 1990 годзе Ю.А. Смірновым была прадстаўлена шматузроўневая мадэль марфалогіі пахавання. Пахавальны комплекс вызначаўся ўжо як сістэма з чатырох узаемазвязаных і ўзаемазалежных складаючых элементаў: пахавальнага збудавання, астанкаў памерлага, пахавальнага інвентару і «дадатковай структуры». Першыя два элементы з'яўляюцца абавязковымі. Пахавальны інвентар і дадатковая структура сустракаюцца не заўсёды. На думку Ю.А. Смірнова, любое пахавальнае збудаванне з'яўляецца спалучэннем двух пачатковых архетыпаў – «ямы» і «насыпа» (паглыблення і ўзвышэння). Даследчык прапанаваў дыферэнцыраваць паняцце «дадатковай структуры», вылучыўшы наступныя дадатковыя структуры: суправаджальную (знаходзіцца ў межах магілы, але не ўтварае канструктыўнага элемента пахавальнага збудавання; напрыклад, вогнішча), спадарожную (знаходзіцца па-за межамі магілы, але ў межах пахавальнага збудавання; напрыклад, храм-пахавальня), сумежную (знаходзіцца па-за межамі пахавальнага збудавання; напрыклад, дарога да пахавання) і датычную (знаходзіцца па-за межамі пахавальнага комплексу) [9, с. 218, 223 – 224].

Важкі ўнёсак у распрацоўку катэгарыяльнага апарата, прызначанага для аналізу пахаванняў, зрабіў В.С. Альхоўскі. У 1986 годзе ён прапанаваў трохузроўневую схему пахавальнага помніка. Пахавальнае збудаванне, астанкі пахаванага і пахавальны інвентар вылучаны ім у якасці складаючых элементаў такога віду пахавальнага помніка, як пахаванне. Пахаванне разам з намагільнымі, падкурганнымі, пазакурганнымі збудаваннямі і рэшткамі рытуальных дзеянняў утвараюць такі від пахавальных помнікаў, як пахавальны комплекс. Пахавальныя комплексы і тое, што Ю.А. Смірноў вызначае як сумежныя і датычныя дадатковыя структуры, складаюць метаструктуру пахавальнага комплексу, які з'яўляецца трэцім відам пахавальных помнікаў [10, с. 70 – 71]. Як адзначыў В.С. Альхоўскі, яго схема не супярэчыць схеме Ю.А. Смірнова, а ўдакладняе яе. У прыватнасці, паводле В.С. Альхоўскага, намагільнае збудаванне варта разглядаць асобна ад уласна пахавальнага. Суадносіны ўласнай схемы пахавальнага помніка і мадэлі Ю.М. Смірнова В.С. Альхоўскі праілюстраваў у табліцы [7, с. 88 – 90].

Структура пахавальнага помніка паводле В.С. Альхоўскага і Ю.А. Смірнова

| Групы элементаў | Паводле В.С. Альхоўскага | Паводле Ю.А. Смірнова |
|---|---|---|
| I | Пахавальнае збудаванне | Пахавальнае збудаванне + дадатковая суправаджальная структура + (дадатковая спадарожная структура) |
| II | Астанкі пахаванага | Астанкі пахаванага |
| III | Пахавальны інвентар | Пахавальны інвентар |
| IV | Намагільнае збудаванне і рэшткі рытуальных дзеянняў | (Дадатковая спадарожная структура) |
| V | Падкурганнае збудаванне і рэшткі рытуальных дзеянняў | Дадатковая сумежная структура |
| VI | Па-за курганнае збудаванне і рэшткі рытуальных дзеянняў | |
| VII | Метаструктура пахавальнага комплексу | Дадатковая датычная структура |

Пад пахавальнымі помнікамі Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў трэба разумець пахаванні, пахавальныя комплексы, што ўтварыліся, і пахавальныя групы (могілкі), што функцыянавалі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў XIV – XVIII стагоддзях. Пахавальныя групы ў якасці структурных элементаў уключаюць у свой склад пахавальныя комплексы, а пахавальныя комплексы – пахаванні. Такое паняцце пахавальнага помніка дазваляе сістэматызаваць і параўноваць інфармацыю як аб асобных даследаваных курганах або грунтовых магілах, так і аб іх групах – могільніках.

**Пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў і помнікі са знешнімі прыкметамі пахаванняў XIV – XVIII стагоддзяў.** Археалагічнымі раскопкамі, археалагічным назіраннем і археалагічнымі разведкамі з ускрыццём культурнага слоя выяўлена і даследавана каля 40 пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў – сорак пахавальных помнікаў на 5 ста-

годдзяў і на ўсё Беларускае Падзвінне. Несумненна, што колькасць могілак у XIV – XVIII стагоддзях была значна, на парадак, большай. Да таго ж палова з даследаваных помнікаў адносіцца да гарадскіх, сканцэнтраваных пераважна ў двух населеных пунктах – Полацку і Віцебску [11]. Пры гэтым у межах даследуемага перыяду як колькасць сельскіх населеных пунктаў, так і колькасць сельскага насельніцтва значна перавышалі колькасць гарадоў і гарадскога насельніцтва. З-за малой колькасці даследаваных сельскіх пахавальных помнікаў іх картаграфаванне не дае магчымасці выяўляць рэгіёны максімальнай канцэнтрацыі аб’ектаў і ажыццяўляць іншыя аперацыі візуальнага аналізу.

Аднак колькасць пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў можа быць пашырана за кошт аб’ектаў, якія маюць знешнія прыкметы пахаванняў разглядаемага перыяду. Прааналізаваўшы вынікі раскопак каменных могільнікаў на тэрыторыі Беларусі, А.В. Квяткоўская прыйшла да высновы, што форма і канструктыўныя асаблівасці каменнай намагільнай канструкцыі могуць дастаткова надзейна ўказваць на час, да якога адносіцца пахаванне. Напрыклад, каменная вымастка памерамі 2,8 – 3 × 1 – 1,4 × 0,2 – 0,35 м без вялікіх камянёў у галавах і нагах пахавання можа быць датавана перыядам не пазней за пачатак XIII стагоддзя. Надмагіллі з камянём вышынёй да 1 м у галавах, з выбітым на камяні крыжам або крыжападобным знакам датуюцца перыядам з сярэдзіны XVI да канца XVII стагоддзя і пазней [12, с. 161].

Не закранаючы пытання магчымасці вузкага датавання пахавальных помнікаў без раскопак, па намагільных канструкцыях (вопыт уласных шурфовак на могільніках каля вёсак Івесь і Доўгае Глыбоцкага і Бірулі Докшыцкага раёнаў сведчыць аб тым, што без зняцця дзёрну выяўленне намагільных канструкцый часта немагчыма), можна канстатаваць апраўданасць падыходу для выяўлення і вызначэння пахавальных помнікаў у межах храналагічнага дыяпазону XIV – XVIII стагоддзяў. Так, Л.В. Дучыц і В.М. Ляўко ў якасці маркераў пахаванняў XIV – XVIII стагоддзяў вылучаюць валунныя кладкі-вымасткі, каменныя абкладкі намагільнага насыпу па перыметры, вялікія валунныя камяні ў галавах або ў галавах і нагах пахавання, каменныя крыжы [13, с. 126, 136].

Безумоўна, варта ўлічваць, што дакладнае вызначэнне храналогіі пахаванняў магчыма толькі па выніках археалагічных раскопак, бо магілы з каменнымі крыжамі і абкладкамі могуць адносіцца і да XIX стагоддзя. Не выключана і «другаснае выкарыстанне» каменных крыжоў. Прымаючы да ўвагі, што на тэрыторыі Беларускага Падзвіння фіксуецца традыцыя працяглага выкарыстання могільнікаў і ў межах аднаго помніка часта сустракаюцца курганы і грунтовыя магілы з каменнымі вымасткамі, такое спалучэнне можна лічыць важкім аргументам на карысць выкарыстання могільніка ў XIV – XVIII стагоддзях і наяўнасці на ім пахаванняў гэтага перыяду.

Картаграфаванне пахавальных помнікаў XIV – XVIII стагоддзяў і пахавальных помнікаў са знешнімі прыкметамі пахаванняў XIV – XVIII стагоддзяў дазваляе выявіць асаблівасці іх размяшчэння. Пераважная большасць з іх лакалізавана на левабярэжжы Заходняй Дзвіны. Найбольшая шчыльнасць пахавальных комплексаў з каменнымі намагільнымі канструкцыямі назіраецца ў Глыбоцкім раёне, на паўднёвым захадзе Полацкага і ў Лепельскім раёнах. Канцэнтрацыя пахаванняў з каменнымі крыжамі назіраецца ў Глыбоцкім, паўднёвым захадзе Полацкага і ў Бешанковіцкім раёнах [11]. Калі разглядаць каменныя крыжы як маркер больш позніх (у межах XIV – XVIII стст.) пахавальных помнікаў, то супадзенне арэалаў распаўсюджвання пахаванняў з валуннымі намагільнымі канструкцыямі і з каменнымі крыжамі можна разглядаць як прыкмету пераемнасці ў традыцыях стварэння надмагілляў.

**Пытанне класіфікацыі пахавальных помнікаў.** Пытанне класіфікацыі пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў і вызначэння карэляцыі паміж таксонамі патрабуе асобнага разгляду, таму абмяжуемся самымі агульнымі момантамі, якія павінна ўлічваць такая класіфікацыя. Класіфікацыя можа быць праведзена на кожным узроўні пахавальнага помніка. На вышэйшым узроўні – узроўні пахавальнай групы – могілкі дзеляцца на сельскія і гарадскія (дакладней, могілкі ў гарадах, мястэчках і замках) [13, с. 129, 132, 135]. Паколькі ў пахавальную групу ўваходзяць не толькі пахавальныя комплексы, але і дадатковыя, звязаныя з могілкамі элементы, важным падаецца наяўнасць на могілках царквы, касцёла, капліцы – нейкай культавай пабудовы. Такім чынам, пахавальныя групы можна падзяліць на могілкі з культавымі пабудовамі ў метаструктуры пахавальнага помніка (або ў якасці дадатковай структуры) і могілкі без культавых пабудоў.

На ўзроўні пахавальнага комплексу вылучаюцца курганы і грунтовыя магілы, а таксама пахаванні ў культавых пабудовах. Грунтовыя магілы могуць быць без намагілляў або з каменнымі намагіллямі розных канструкцый (вымасткі, абкладкі разнастайных форм і памераў і г.д.). Асобна варта закрануць могільнікі, якія ўтвараюцца пахавальнымі комплексамі з рознатыповымі намагіллямі. Так, могільнікі, дзе маюцца земляныя і каменныя курганы, грунтовыя магілы з разнастайнымі каменнымі намагіллямі вызначаюцца як курганна-жальнічныя могільнікі [13, с. 125 – 126].

На ўзроўні пахаванняў плённым здаецца падзел паводле пахавальнага інвентару. Большасць пахаванняў XIV – XVIII стагоддзяў з’яўляюцца безынвентарнымі. Пахавальны інвентар мэтазгодна падзяліць на дзве групы. Да першай адносяцца дэталі вопраткі ў шырокім сэнсе (уключаючы ўласна адзенне, абутак,

галаўныя ўборы, дэталі касцюма), а таксама ювелірныя вырабы і прадметы – маркеры канфесійнай прыналежнасці. Наяўнасць у пахаваннях падобных рэчаў не супярэчыць нормам хрысціянскай рэлігіі. Да другой групы адносяцца манеты, асабістыя рэчы, посуд. Прысутнасць артэфактаў дадзенай групы будзе ўказваць на тое, што пахаванне зроблена не строга паводле хрысціянскіх канонаў.

**Заключэнне.** Пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў уяўляюць пахаванні, пахавальныя комплексы, што ўтварыліся, і пахавальныя групы (могілкі), што функцыянавалі на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў XIV – XVIII стагоддзях. Пахавальны помнік уяўляе сабой трохузроўневую сістэму, што ў залежнасці ад узроўню можа ўключаць у свой склад пахавальныя помнікі ніжэйшых узроўняў у якасці структурных элементаў. Колькасць пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў, даследаваных з ускрыццём культурнага слоя, невялікая. Аднак кола пахавальных помнікаў можна пашырыць за кошт помнікаў са знешнімі прыкметамі пахаванняў XIV – XVIII стагоддзяў. Класіфікацыя пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў мусіць улічваць наяўнасць і форму намагільнага збудавання, наяўнасць культавай пабудовы ў структуры (метаструктуры) пахавальнага помніка і асаблівасці пахавальнага інвентару.

ЛІТАРАТУРА

1. Гуляев, В.И. Изучение погребального обряда в зарубежной археологии / В.И. Гуляев // Краткие сообщения института археологии РАН. – 2010. – Вып. 224. – С. 5 – 19.
2. Алексеев, Л.В. Археология и краеведение Беларуси: XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В. Алексеев; под ред. Б.А. Рыбакова. – Минск: Беларус. навука, 1996. – 206 с.
3. Брей, У. Археологический словарь / У. Брей, Д. Трамп. – М.: Прогресс, 1990. – 368 с.
4. Матюшин, Г.Н. Археологический словарь / Г.Н. Матюшин. – М.: Просвещение: учеб. лит., 1996. – 304 с.
5. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.
6. Вайцяховіч, А.В. Пахавальны абрад / А.В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск: БелЭн, 2011. – Т. 2: Л – Я. – С. 177 – 178.
7. Ольховский, В.С. Погребальная обрядность (содержание и структура) / В.С. Ольховский // Российская археология. – 1993. – № 1. – С. 78 – 93.
8. Леонова, Н.Б. Погребение как объект формального анализа / Н.Б. Леонова, Ю.А. Смирнов // Краткие сообщения института археологии. – 1977. – Вып. 148. – С. 16 – 23.
9. Смирнов, Ю.А. Морфология погребения (Опыт создания базовой модели) / Ю.А. Смирнов // Исследования в области балто-славянской духовной культуры. Погребальный обряд. – М.: Наука, 1990. – С. 216 – 224.
10. Ольховский, В.С. Погребально-поминальная обрядность в системе взаимосвязанных понятий / В.С. Ольховский // Советская археология. – 1986. – № 1. – С. 65 – 76.
11. Чараўко, В.У. Матэрыялы да карты пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стагоддзяў / В.У. Чараўко // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Серия А. Гуманитарные науки. – 2010. – № 7. – С. 14 – 20.
12. Квятковская, А.В. Ятвяжские могильники Беларуси (конец XI – XVII вв.) / А.В. Квятковская. – Вильнюс: Diemedzio, 1998. – 327 с.
13. Археалогія Беларусі: у 4 т. / В.М. Ляўко [і інш.]; пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1998 – 2001. – Т. 4: Помнікі XIV – XVIII стст. – 2001. – 597 с.

*Пастуиіў 28.11.2011*

## THE FUNERAL MONUMENTS OF BELARUSSIAN DVINA REGION OF THE 14$^{th}$ – 18$^{th}$ CENTURIES: DEFENITION, STRUCTURA, CLASSIFICATION

***V. CHEREVKO***

*The article considers theoretical approaches to the definition of a funeral monument as a category of archaeological science. It deals with the structure of the funeral monument in relation to Belarussian Dvina region of the 14$^{th}$ – 18$^{th}$ centuries. Under the funeral monument of Belarussian Dvina region of the 14$^{th}$ – 18$^{th}$ centuries we understand a burial,a funeral or cemetery complex, created on the territory of Belarussian Dvina region in the 14$^{th}$ – 18$^{th}$ centuries. The selection of the group of funeral monuments with external signs of burials of the 14$^{th}$ – 18$^{th}$ centuries allowed to expand the body of interest and trace the features of its spacial location. The classification of funeral monuments of Belarussian Dvina region is given depending on the presence of a grave mound, the existence of a worship place in the structure or metastructure of a funeral monument, the features of grave goods.*